# Ведаць мову, каб не страціць свой "код"

Напярэдадні 8 Сакавіка ў сценах сярэдняй школы № 7 г. Смаргоні адбылася сустрэча з вельмі таленавітым чалавекам: паэтэсай Смаргоншчыны, членам Саюза пісьменнікаў Беларусі з 2003 года, Лаўрэатам літаратурнай прэміі Цёткі, журналістам Алай Леанідаўнай Клемянок.

Ала Леанідаўна - вельмі чулая і паэтычная натура, якая па-свойму асэнсоўвае розныя тэмы, мае свой стыль, сваю арыгінальную і непаўторную манеру пісьма.

Ала Леанідаўна нарадзілася ў горадзе Маладзечна, там жа закончыла музычную школу, але вельмі любіць Смаргонь, якая стала дарагой яе сэрцу. Паэтэса імкнулася на прыкладах з уласнага жыцця паказаць падрастаючаму пакаленню ролю роднай мовы ў жыцці чалавека, перадаць любоў да роднай смаргонскай зямлі, даказваючы тым самым, што нам ёсць чым ганарыцца, малявала вобраз сапраўднага чалавека.

Сустрэча з Алай Леанідаўнай  не пакінула раўнадушнымі нікога: ні вучняў, ні настаўнікаў. Сціплая, прыгожая, творчая жанчына імкнулася ў час размовы крануць дзіцячыя сэрцы цёплым, мілагучным словам на матчынай мове, чытаючы вершы і спяваючы песні.

Час праляцеў вельмі хутка. Сустрэча закончылася словамі падзякі, пажаданнем творчага ўздыму, натхнення.












**Людміла Пашкевіч,**

**настаўніца беларускай мовы і літаратуры**

**сярэдняй школы № 7 г.Смаргоні**